УДК 726.5.04 (476)

# Аб’ёмна-планіровачныя структуры сучасных праваслаўных храмаў Беларусі

Арабей В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Злучэнне функцыянальнай арганізацыі і планіровачнага рашэння, выяўленне іх аб’ёмных характарыстык, размяшчэнне малітоўных залаў і прыдзелаў, колькасць узроўняў будынку царквы, размяшчэнне апсіды, званіцы і хораў характарызуе аб’ёмна-планіровачную структуру храма.

**Малітоўная зала** з’яўляецца асноўным элементам аб’ёмна-планіровачнай структуры прыходскага храма і яе цэнтрам пры ўсіх варыянтах кампазіцый. З поўначы і поўдня адносна малітоўнай залы часам ствараюцца прыдзелы, якія могуць мець як меншую, так і аднолькавую з асноўным аб’ёмам вышыню. Асноўная кампазіцыйная роля адводзіцца цэнтральнай частцы малітоўнай залы, над якой узводзіцца шатровае, купальнае альбо іншае завяршэнне з крыжом.

**Колькасць узроўняў** з’яўляецца адной з найбольш важных характарыстык, якая ўплывае на фарміраванне аб’ёмна-планіровачнага рашэння прыходскага храма, асабліва высотнага развіцця кампазіцыі. Яна залежыць ад колькасці вернікаў, велічыні паселішча, функцыянальнага насычэння царквы. У сучаснай практыцы праваслаўнага храмабудаўніцтва Беларусі былі выяўлены тры асноўныя варыянты прыходскіх храмаў: 1-узроўневыя, 2-узроўневыя і 3-узроўневыя. Вылучаюцца тры віды ўзроўняў: сутарэнны альбо цокальны, першы, другі.

**Апсіда** як архітэктурны элемент, у якім размяшчаецца самая святая частка храма – алтар, актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні аб’ёмна-планіровачнай структуры прыходскага храма. Вылучаюцца 2 варыянты кампаноўкі апсіды з асноўным аб’ёмам храма: 1) убудаваная апсіда; 2) прыбудаваная апсіда.

**Форма апсід** сучасных храмаў Беларусі прадстаўлена трыма асноўнымі рашэннямі: 1) паўцыркульная; 2) гранёная; 3) прамавугольная. Як выключэнне, сустракаюцца апсіды трохвугольнай формы.

**Званіца**, якая найчасцей размяшчаецца ў вежы, у значнай ступені ўзбагачае аб’ёмна-прасторавую структуру прыходскага храма і з’яўляецца адным з асноўных яго вертыкальных аб’ёмаў. Архітэктура сучасных праваслаўных званіц, якія ўваходзяць у склад будынка царквы, прадстаўлена двума тыпамі: надбудаваная і прыбудаваная.

**Хоры** сучасных праваслаўных храмаў маюць тры варыянты размяшчэння ў аб’ёмна-планіровачным рашэнні прыходскага храма: 1) прыбудаваныя; 2) убудаваныя; 3) П-падобныя.